Пролетарыі ўсіх краін, єднайцеся!

ВОЛЬНАЯ ПРАЦА

Орган Беластоцкага абкома і гаркома КП(б)Б і аблвыканкома.

Год выдання другі.

№ 63 (132)
НЯДЗЕЛЯ
17
САКАВІКА
1940 г.

Цана 10 капеек

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

ПАДЗЯКА

Прыношу глыбокую падзяку ўсім арганізацыям, групам і асобам, якія прыслалі прывітанні і віншаванні ў сувязі з маім пяцідзесяцігоддзем.

В. МОЛАТАЎ.

Масква, 15 сакавіка

СОВЕЦКІ ПАШПАРТ

Новыя совецкія грамадзяне заходніх абласцей пачалі атрымліваць совецкія пашпарты. Совецкі пашпарт з'яўляецца адзіным дакументам, які сведчыць аб асобе совецкага грамадзяніна. Совецкі пашпарт гэта дакумент члена вялікай шчаслівай сям'і народаў СССР, дзе ўсе грамадзяне маюць вялікія правы, запісаныя ў Сталінскай Канстытуцыі.

А правы совецкіх грамадзян надзвычай вялікія! Кожны грамадзянін СССР мае права выбіраць у свае органы ўлады і быць сам абраным. У СССР усе грамадзяне маюць гарантыраваную работу з аплатай іх працы ў адпаведнасці з колькасцю і якасцю. Абучэнне праводзіцца для ўсіх грамадзян бясплатна. Жанчына ў Совецкім Саюзе мае роўныя правы з мужчынам.

Такіх правоў не мелі і не маюць грамадзяне ні ў адной капіталістычнай краіне. Правы совецкіх грамадзян строга ахоўваюцца законам, аб чым запісана ў 123 артыкуле Канстытуцыі СССР.

«Роўнапраўе грамадзян СССР,—гаворыцца ў Канстытуцыі,—незалежна ад іх нацыянальнасці і расы, ва ўсіх галінах гаспадарчага, культурнага і грамадска-палітычнага жыцця, з'яўляецца няўхільным законам. Якое-б ні было прамое, ці ўскоснае агранічэнне правоў або, наадварот, устанаўленне прамых ці ўскосных пераваг грамадзян у залежнасці ад іх расавай і нацыянальнай прыналежнасці, роўна як і ўсякая пропаведзь расавай ці нацыянальнай выключнасці, або нянавісці і пагарды — караюцца законам».

Працоўныя вызваленых абласцей былой Заходняй Беларусі карыстаюцца ўсімі дабротамі Сталінскай Канстытуцыі. У Беластоку і абласці атрымалі работу больш 10 тысяч беспрацоўных. Некалькі дзесяткаў тысяч бежанцаў накіраваны з Беластока і абласці на работу ва ўсходнія раёны БССР. Пры совецкай уладзе ў Беластоку і абласці адкрыты дзесяткі новых бальніц, амбулаторый, паліклінік. У школах пачалася вучоба на роднай мове. Колькасць вучняў у школах нашай абласці павялічылася больш чым на 80 тысяч чалавек. Грамадзяне заходніх абласцей БССР рыхтуюцца да выбараў сваіх дэпутатаў на аснове самай дэмакратычнай Сталінскай Канстытуцыі.

З атрыманнем пашпарта канчаткова афармляецца грамадзянства і падданства да вялікай соцыялістычнай дзяржавы.

Зусім інакш абстаіць справа з грамадзянствам, з пашпартам у капіталістычных краінах. Там пашпарты не аднолькавыя, як неаднолькавае само жыццё для людзей. Буржуазія і другія прывілеяваныя класы маюць асобыя правы, а разам з гэтым і асобыя пашпарты. У былой панскай Польшчы вельмі многа беларусаў і яўрэяў зусім не мелі пашпартаў, як палітычна «нявытрыманыя» і «нядобранадзейныя». Многія грамадзяне не жадалі мець польскі пашпарт.

Былая работніца-тэкстыльшчыца, зараз супрацоўніца Беластоцкага аблвыканкома, кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета Саюза ССР Марыя Іванаўна Дз'ячук расказвае наступнае:

— У 1928 годзе беластоцкі стараста прапанаваў мне атрымаць польскі пашпарт, а адсюль і прыняць польскае падданства. Але я не верыла ў польскую дзяржаву, бо ведала, што раня ці позна нас возьме пад абарону Совецкі Саюз, і, не гледзячы на магчымыя непрыемныя вынікі, я адказалася ад польскага пашпарта.

З ласкай і любоўю адклікаецца Марыя Іванаўна Дз'ячук аб совецкім пашпарце.

— Мне патрэбна было ехаць у камандыроўку, — расказвае яна, — але калі даведалася, што пачынаецца выдача совецкіх пашпартаў, усё адклала. Рашыла ехаць у камандыроўку са сваім совецкім пашпартам.

Глыбока вызначыў розніцу паміж капіталістычным і совецкім пашпартам вялікі паэт Владзімір Маякоўскі. Аб польскім пашпарце ён сказаў:

«На польский глядят,
как в афишу коза.
На польский —
выпяливают глаза
в тугой
полицейской словесности
откуда, мол, —
и что это за
географические новости.»

Па іншаму гучаць словы паэта аб совецкім пашпарце. Ён гаварыў:

— «Читайте
завидуйте,
Я —
гражданин
Советского Союза!»

Выдача совецкіх пашпартаў — вялікая і адказная палітычная задача. Нельга праводзіць гэту кампанію як толькі тэхнічную справу, якая даручаецца толькі адной міліцыі.

Аднак, важнасць гэтай задачы зразумелі не ўсюды. Многія совецкія, профсаюзныя і іншыя арганізацыі да апошняга часу не ўключыліся ў работу па аказанню дапамогі органам Рабоча-Сялянскай Міліцыі ў правядзенні пашпартызацыі.

Абком ЛКСМБ не мабалізаваў на гэту справу комсамольцаў абласці. Асобныя кіраўнікі прадпрыемстваў і ўстаноў, як паведамлялася ў нашай газеце ад 10 сакавіка, нясвоечасова выдаюць рабочым і служачым неабходныя даведкі з месца работы, не прадстаўляюць у тэрмін памяшканняў для выдачы пашпартаў і т. д. Недапушчальную недаацэнку пашпартызацыі праявіла адміністрацыя беластоцкага тэкстыльнага камбіната № 3, якая не дапамагла рабочым арганізаваць фота-здымкі для пашпартаў.

Масава-растлумачальная работа паранейшаму пастаўлена дрэнна на значнай часцы прадпрыемстваў і ўстаноў Беластока, Бельска, Ломжы і іншых месц.

Выдача совецкага пашпарта— гэта вялікая і радасная падзея для ўсіх грамадзян. Мы абавязаны зрабіць усё, каб ліквідаваць блытаніну, бюракратызм, неарганізаванасць пры атрыманні грамадзянамі гэтага каштоўнага дакумента.

БЛІЗІЦЦА РАДАСНЫ ДЗЕНЬ ВЫБАРАУ У ВЯРХОУНЫЯ СОВЕТЫ СССР І БССР



ЕЎГЕНІЙ АФАНАСЬЕВІЧ ШЧУКІН,
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 335.



ПАВЕЛ ІВАНАВІЧ БЯЛЫ
кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР па выбарчай акрузе № 337

Сустрэчы кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Шчукіна Е. А. з выбаршчыкамі

З вялікім уздымам прайшлі сустрэчы кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Шчукіна з выбаршчыкамі 335 Снядоўскай выбарчай акругі. Выбаршчыкі вёсак Гняздова, Любоціна, Падбелле, Шумава і іншых цёпла і прыветна сустракалі свайго кандыдата.

У вёсцы Гняздова на сустрэчу з кандыдатам сабраліся ўсе выбаршчыкі, мужчыны і жанчыны. У сельскай школе, дзе праходзіла сустрэча, прысутнічала 150 чалавек.

Пасля выступлення баявога камісара ордэнаносца тав. Шчукіна, узяў слова селянін тав. Ашацкі. У сваёй кароткай, але яркай прамове тав. Ашацкі заклікаў усіх выбаршчыкаў вёскі Гняздова ў дзень выбараў аддаць свае галасы за кандыдата блока комуністаў і беспартыйных, за большэвіка тав. Шчукіна. Выбаршчыкі парашылі ў дзень выбараў арганізавана з'явіцца на выбарчы ўчастак і прагаласаваць за свайго кандыдата.

З вялікай актыўнасцю сустрэлі тав. Шчукіна выбаршчыкі вёскі Любоціна. У сваіх выступленнях яны расказалі кандыдату аб велізарным жаданні сустрэць першую большэвіцкую вясну калектыўнай працай на вызваленай зямлі. Паведаміўшы аб тым, што ў вёсцы налічваецца 11 сялянскіх двароў, якія жадаюць аб'яднацца ў сельскагаспадарчую арцель, выбаршчыкі прасілі свайго кандыдата дапамагчы ім у арганізацыі арцелі.

Выступаючы перад выбаршчыкамі мястэчка Шумава, тав. Шчукін падрабязна спыніўся на апошніх падзеях, расказаў аб падпісанні мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндскай Рэспублікай.

У заключэнне сваёй прамовы тав. Шчукін заклікаў сваіх выбаршчыкаў, сялян мястэчка Шумава, па-большэвіцку рыхтавацца да веснавой сяўбы. Выступаючыя ў спрэчках сяляне запэўнілі свайго кандыдата, што яны арганізавана сустрэнуць першую свабодную вясну і засеюць ўсю сваю зямлю высокаякасным зярном. Яны абяцалі 24 сакавіка ўсім, як аднаму з'явіцца да выбарчых урнаў і аддаць свае галасы за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных.

Тав. Шчукін сустрэўся таксама з выбаршчыкамі вёсак Падбелле, Дворная Якаць, Старая Якаць, Маладая Якаць і інш. Сяляне ішлі са сходаў з аднадушным рашэннем — у дзень выбараў галасаваць за кандыдатаў сталінскага блока, за верных сыноў нашай вялікай радзімы.

Л. Федасенка.

АДАДЗІМ СВАЕ ГАЛАСЫ ЗА ТАВ. РАДЗЕВІЧА

У Гродне праходзяць сустрэчы выбаршчыкаў са сваімі кандыдатамі ў дэпутаты Вярхоўных Советаў СССР і БССР.

У памяшканні шостага выбарчага ўчастка на сустрэчы з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Радзевічам Міхаілам Вікенцьевічам прысутнічала каля 300 чалавек. Тав. Радзевіч расказаў прысутным свой жыццёвы шлях.

Выступіўшы на гэтай сустрэчы выбаршчык тав. Рабіновіч В. Ю. заявіў:

— Зараз усе мы актыўна рыхтуемся да свайго ўсенароднага свята—дня выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. У вярхоўныя органы ўлады мы павінны выбраць лепшых сваіх сыноў, якія-б на справе апраўдалі наша давер'е. Такім з'яўляецца тав. Радзевіч Міхаіл Вікенцьевіч. Я ўпэўнен, што ён з чэсцю апраўдае наша давер'е.

У аднагалосна прынятай рэзалюцыі гаворыцца:

— Мы, выбаршчыкі 6-га выбарчага ўчастка, горача падтрымліваем вылучэнне кандыдата ў дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Радзевіча Міхаіла Вікенцьевіча.

Мы ўсе, як адзін, у дзень 24 сакавіка аддадзім за яго свае галасы. Мы ўпэўнены, што наша давер'е ён апраўдае з чэсцю.

В. Гарбаноў.

Перадвыбарчыя дні ў вёсцы Енкі

Добра пастаўлена работа на выбарчым участку № 91 у вёсцы Енкі, Ломжынскага раёна.

24 агітатары—мясцовыя сяляне і служачыя—праводзяць з выбаршчыкамі цікавыя і ажыўленыя гутаркі. Лепшымі агітатарамі з'яўляюцца селянін Пятро Рацыборскі, настаўніца Марыя Вераніцкая і іншыя. Агіткалектывам кіруе тав. Мельнік. Ён часта збірае агітатараў, праводзіць з імі семінары, нарады па амбену вопытам работы.

Арганізавана 20 гурткоў па вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. У гуртках ужо адбылося па 7—8 заняткаў.

З выбаршчыкамі праведзена каля 20 сходаў, на якіх прысутнічала 1.880 чалавек. Усе выбаршчыкі добра азнаёмлены з біяграфіямі кандыдатаў.

Днямі праведзен сход моладзі вёсак Лунянскага сельскага совета, на якім быў абмеркаван даклад аб задачах моладзі ў выбарчай кампаніі. Моладзь узяла на сябе абавязацельствы быць передавой у выбарах у Вярхоўныя Советы СССР і БССР.

Па ініцыятыве моладзі ў бліжэйшых вёсках у чэсць выбараў арганізаван чырвоны абоз з зярном. Сяляне вёскі Старая Лунянка прадалі дзяржаве 40 цэнтнераў зярна, а сяляне вёсак Енкі, Вулькі, і іншых — 138 цэнтнераў.

Памяшканне выбарчага ўчастка прыгожа аформлена. Маецца дастатковая колькасць лозунгаў, партрэтаў членаў Палітбюро ЦК ВКП(б) і плакатаў. Бібліятэчка мае дастаткова выбарчай літаратуры. Каля выбарчага ўчастка будуецца арка, гатовы ўжо кабіны і ўрны для галасавання.

Ужо недалёка знамянальны дзень—24 сакавіка, калі вызваленыя ад панскага гнёту, сяляне прыдуць да выбарчых урнаў і прагаласуюць за сваіх народных кандыдатаў.

Пузікаў.

РАТЫФІКАЦЫЯ ФІНЛЯНДСКІМ СЕЙМАМ СОВЕЦКА-ФІНЛЯНДСКАГА МІРНАГА ДАГАВОРА

Стакгольм, 16 сакавіка. (ТАСС). Учора на пасяджэнні фінляндскага сейма абмяркоўвалася пытанне аб ратыфікацыі совецка-фінляндскага мірнага дагавора. Камісія па замежных справах сейма ўнесла прапанову аб ратыфікацыі дагавора. Прем'ер-міністр Руці паведаміў аб заключэнні мірнага дагавора прадстаўнікамі ўрада Фінляндыі і СССР і рэкамендаваў сейму ратыфікаваць дагавор.

Дагавор быў ратыфікаван большасцю галасоў у 145 супроць трох.

24 САКАВІКА — ВЫБАРЫ Ў ВЯРХОЎНЫЯ СОВЕТЫ СССР І БССР

КАНДЫДАТ У ДЭПУТАТЫ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР ПА 358 ВЫБАРЧАЙ АКРУЗЕ

Сцефаніда Іванаўна Красніцкая

(БІЯГРАФІЧНЫ НАРЫС)

Ад хаты да хаты распаўсюджвалася па вёсцы Цеснае прынесенае хадакамі з горада паведамленне аб пераходзе Чырвонай Арміяй былой польскай граніцы. Гэта радасная вестка менш чым за поўгадзіны абляцела ўсе 57 двароў. Сяляне з небывалай радасцю віншавалі адзін другога. У хадакоў, сваіх-жа аднавяскоўцаў, яны настойліва дапытваліся:

— І да нас прыдуць? Назаўсёды? Праз колькі дзён будзем сустракаць? Ці можна ўжо зараз вывесіць чырвоныя сцягі?..

У падрыхтоўцы да сустрэчы Чырвонай Арміі вызначылася бяднячка Сцефаніда Іванаўна Красніцкая. Яна, як для вялікага свята, віла вянкі, абшывала сцягі. А свайго старэйшага, дванаццацігадовага сына Лявона неаднаразова дапытвалася:

— Ну, як? Не відаць?

І мацярынскім тонам загадвала:

— Глядзі-ж, пільнуй як належыць! На дарогу часцей выходзь сам і накіроўвай другіх. Як заўважыце—хутчэй да мяне ці да дзядзькі Міхала...

Аб набліжэнні Чырвонай Арміі ў Цесным даведаліся ад сялян суседніх вёсак. Усе: старыя і дзеці — кінуліся на дарогу, што за два кілометры ад вёскі. У першых радах ішла Сцефаніда Іванаўна. Пільна ўглядаючыся ў той бок, адкуль павінны паказацца вайсковыя часці, яна абдумвала кожнае слова свайго прывітання байцам. Яе ахапіла жаданне—выказаць усё, што накіпела на сэрцы, першым совецкім прадстаўнікам, выказаць і перадаць праз іх сваю шчырую падзяку совецкаму народу за вялікія клопаты аб сваіх братах і сёстрах, за вызваленне ад панскага прыгнечання.

Доўга цягнуліся мінуты. Нецярплівая Сцефаніда Іванаўна сумесна з іншымі сялянамі і сялянкамі пайшла на сустрач... Але шмат ісці не прышлося. Скора паказаліся танкі і матарызаваныя чырвонаармейскія калоны. Праз адну-дзве мінуты калоны танкаў і машын праходзілі міма соцень цеснаўскіх мужчын, жанчын і дзяцей. Пад гул танкаў і машын, пад гул сялянскіх прывітанняў свае гарачыя словы, кінутыя першым байцам, Сцефаніда Іванаўна паўтарала пры сустрэчы кожнага падраздзялення.

— 20 год над намі здзекваліся польскія паны, — гаварыла яна,—20 год нам забаранялі гаварыць на сваёй роднай мове, нас не лічылі за людзей!.. Самае вялікае дзякуй перадаём вам, дарагія совецкія браты! Няхай жывуць нашы вызваліцелі—большэвікі! Няхай жыве Чырвоная Армія! Няхай жыве наш вялікі родны бацька Сталін!

* * *

Смеласць і актыўнасць паявіліся ў Сцефаніды Іванаўны толькі з прыходам Чырвонай Арміі. Да гэтага яе ведалі ў вёсцы, як цёмную і забітую сялянку. Яна раней ніколі не чытала газет, не выступала перад сялянамі. Нарадзіўшыся ў вёсцы Цясное (Беластоцкі раён) і пражыўшы ў ёй 39 год, да прыходу Чырвонай Арміі не ездзіла на чыгунцы. Тады ёй было не да гэтага...

Бацька Сцефаніды Іванаўны—Іван Іванавіч Ермацэвіч—да канца свайго жыцця быў бедняком. Сям'я з сямі душ заўсёды жыла ў нястачы. Пасля выхаду замуж жыццё Сцефаніды таксама працягвалася бедна і бязрадасна. Асабліва невыносным станавілася існаванне, калі ў сям'і памёршага свёкра раздзяліліся сыны. Мужу Сцефаніды, як і астатнім яго братам, дастаўся толькі адзін гектар ворнай зямлі.

Але самая найгоршая пара настала яшчэ пазней. У 1934 годзе Сцефаніда Іванаўна асталася без мужа з трыма малышамі. Мужа забілі бандыты, пры чым забойцы асталіся беспакаранымі. Першы з іх — багаты ляснік Альховік быў зусім апраўдан панскім судом, а другі—атрымаў за забойства чалавека толькі два з паловай годы турэмнага зняволення. За парубку-ж панскага лесу сялян садзілі ў турму на 3—4 годы.

Згодна польскага закона пасля смерці мужа палавіна ворнай зямлі, што асталася ў Красніцкай, была адабрана. Такім чынам ёй патрэбна было, каб пражыць самой і пракарміць дзяцей, наймацца працаваць. Выратавала старая швейная машына, якую жандары не раз прабавалі, але не змаглі, канфіскаваць за няўплочаныя падаткі. Свайго заработку ўсё-ж нехапала. За дапамогай прыходзілася звяртацца да брата.

Зусім інакш пайшлі справы пасля вызвалення Чырвонай Арміяй народаў Заходняй Беларусі. Сцефаніда Красніцкая атрымала ўсе магчымасці выхоўваць і абучаць сваіх дзяцей. Цяпер яна з ахвотай і жаданнем удзельнічае ва ўсіх сходах сялян вёскі, ва ўсіх гутарках і нарадах. Была на жаночай канферэнцыі ў Собалеве. Шмат часу аддае вывучэнню Сталінскай Канстытуцыі і Палажэння аб выбарах. Вось што расказвае аб новым жыцці сама Сцефаніда Іванаўна.

— Ніякага параўнання з Польшчай! Работы хапае кожнаму. Мае дзеці вучацца на сваёй роднай беларускай мове і бясплатна. Кнігі дзяшовыя. Пры совецкай уладзе ўсюды нас лічаць за людзей, усюды ўсё даступна.

Не думала і не сніла аб такім новым жыцці вызваленая беларуская сялянка. Сцефаніда Іванаўна Красніцкая зараз з'яўляецца кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР.

Якія перамены! Які рост чалавека!

Аднадушна галасуючы за сялянку Сцефаніду Іванаўну Красніцкую, працоўныя Тыкоцінскай выбарчай акругі № 358 будуць галасаваць за сваё новае і шчаслівае жыццё, за сваю вялікую соцыялістычную радзіму.

В. Стальноў.

ПЕРАДВЫБАРЧАЯ ХРОНІКА

Сярод выбаршчыкаў 58 выбарчага ўчастка Пролетарскай акругі (г. Беласток) вялікую агітацыйную работу праводзіць тав. Кібардзін. Арганізаваныя ім гурткі ахопліваюць жыхароў 9 дамоў па Казловай вуліцы. Вакол сябе ён стварыў актыў з ліку выбаршчыкаў, якія дапамагаюць яму ў рабоце. Таварышы Максімовіч, Альшэўская, Мацейчык і многа іншых прымаюць удзел у абсталяванні выбарчага ўчастка, забяспечваюць яўку слухачоў на заняткі гуртка.

Нікіцін.

* * *

Настаўнікі школ мястэчка Гонендз актыўна ўдзельнічаюць у агітацыйна-масавай рабоце. У 12 гуртках пад іх кіраўніцтвам выбаршчыкі вывучаюць Сталінскую Канстытуцыю і Палажэнне аб выбарах. На сходы, праводзімыя агітатарамі, выбаршчыкі прыходзяць ахвотна. Усёй агітацыйна-масавай работай на ўчастку кіруюць тт. Дравасекаў і Арцюхоў.

Гразоўскі.

* * *

Касцюкоўскі выбарчы ўчастак № 132 дзейна рыхтуецца да выбараў у Вярхоўныя Советы СССР і БССР. Памяшканне ўчастка святочна ўпрыгожана. Устаноўлена дзяжурства членаў камісіі. Наладжана агітацыйна-масавая работа. З мясцовых выбаршчыкаў вылучаны 21 агітатар, якія кіруюць 18 гурткамі. Асабліва добра працуюць гурткі, якімі кіруюць тт. Папко і Саламянка.

Дзятлава.

* * *

Падышоўшы да памяшкання Шульбарскай школы, у якой размясціўся 83 выбарчы ўчастак, штодзённа можна бачыць многа народа і фурманак. Сюды з усіх бліжэйшых вёсак з'язджаюцца сяляне, упаўнаважаныя, агітатары.

Члены ўчастковай выбарчай камісіі, агітатары і даверaныя працуюць добра. На ўчастку—36 агітатараў. Лепшыя з іх — настаўнік т. Закшэўскі, селянін т. Супел, жонка чыгуначніка тав. Шыманская, тт. Старчэўскі, Прывалаў, Станьчук, Бажэнаў, Рыжыкаў і інш.

Даверaны тав. Прывалаў увесь вольны ад работы час знаходзіцца на ўчастку. Ён праводзіць сходы, гутаркі, семінары для агітатараў і т. д.

Шашок.



На здымку: Сакратар Валкавыскага райкома КП(б)Б, кандыдат у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Банцыраў гутарыць з кандыдатам у дэпутаты Вярхоўнага Совета БССР тав. Смаржко. (Фота Сапір).

Працоўныя вітаюць мудрую знешнюю палітыку Совецкага ўрада

У рэдакцыю „Вольнай працы" працягваюць паступаць рэзалюцыі шматлікіх сходаў і мітынгаў рабочых, работніц, інжынерна-тэхнічных работнікаў, служачых і сялян у сувязі з заключэннем мірнага дагавора паміж СССР і Фінляндыяй. У кожнай рэзалюцыі працоўныя горача вітаюць сталінскую мірную палітыку Совецкага ўрада, падкрэсліваюць велізарнае значэнне дагавора ў справе аховы совецкіх граніц і безапаснасці гарадоў Ленінграда і Мурманска.

На ўсіх сходах і мітынгах завастраецца ўвага рабочых, работніц, інжынерна-тэхнічных работнікаў і служачых на павышэнне прадукцыйнасці працы, на паляпшэнне абароннай работы на фабрыках, заводах, ва ўстановах і вёсках.

Работнікі Беластоцкай санітарна-эпідэмічнай станцыі ў сваёй рэзалюцыі запісалі:

— Горача вітаем мудрую сталінскую палітыку Совецкага ўрада, якая прысекла ўсе намеры імперыялістычных падпальшчыкаў вайны. Выражаем гарачую ўдзячнасць доблеснай Чырвонай Арміі, якая падняла магутнасць Совецкага Саюза на небывалую вышыню.

300 рабочых, работніц, ІТР і служачых фабрыкі № 23 пішуць:

— Мы з лікаваннем вітаем нашу доблесную Рабоча-Сялянскую Чырвоную Армію, якая забяспечыла геаічнай барацьбой безапаснасць паўночных граніц Совецкага Саюза, безапаснасць буйнага індустрыяльнага цэнтра нашай радзімы — горада Ленінграда. Вітаючы мудрую мірную палітыку Совецкага ўрада, мы ад усяго сэрца дзякуем нашай слаўнай комуністычнай партыі і нашаму любімаму правадыру таварышу Сталіну за справядлівую знешнюю палітыку, якая забяспечыла спакойную працу на карысць нашай соцыялістычнай радзімы. Няхай ведаюць капіталістычныя псы, бразгаючыя зброяй, што наш народ зараз, як ніколі, згуртаван вакол комуністычнай партыі і правадыра народаў таварыша Сталіна. Няхай ведаюць ворагі, што парушыць спакойную працу совецкага народа і безапаснаць нашых граніц нікому і ніколі не ўдасца. Мы за мір, мы вайны не жадаем! Але заяўляем, што кожны совецкі чалавек не пашкадуе свайго жыцця для абароны і забеспячэння безапаснасці соцыялістычнай радзімы. У выпадку неабходнасці па першаму закліку большэвіцкай партыі і Совецкага ўрада ўвесь совецкі народ гатоў у любую мінуту нанесці знішчальны ўдар любому ворагу.

Няхай жыве гераічная непераможная Рабоча-Сялянская Чырвоная Армія і яе правадыр таварыш Варашылаў!

Няхай жыве сталінская мудрая палітыка Совецкага ўрада!

Няхай жыве Ўсесаюзная комуністычная партыя большэвікоў!

Няхай жыве наш бацька, друг, правадыр і настаўнік таварыш Сталін!

Гутаркі з выбаршчыкамі

ШТО ТАКОЕ БУРЖУАЗНАЯ ДЭМАКРАТЫЯ?

«Дэмакратыя» — слова грэчаскае. У перакладзе яно азначае «народаўладдзе». Дэмакратыяй прынята называць форму дзяржаўнага кіравання, пры якой уладу ажыццяўляе сам народ, выбіраючы ўгодных яму прадстаўнікоў у законадаўчыя органы. У многіх буржуазных краінах на словах даўно існуе дэмакратычны лад. Аднак на справе ва ўладзе там стаіць не народ, большасць якога складаюць працоўныя масы рабочых і сялян, а кучка капіталістаў і памешчыкаў.

Былая панская Польшча таксама лічылася краінай як быццам дэмакратычнай. У польскай канстытуцыі 1921 года было нават напісана: «Вярхоўная ўлада ў Польскай рэспубліцы належыць народу». Аднак уся нядоўгавечная гісторыя Польшчы пілсудчыкаў паказала, што сам народ быў адхілен ад якога-небудзь удзелу ў кіраванні краінай. У сейме і сенаце гаспадарылі польскія князі і графы, памешчыкі, фабрыканты, купцы. Нарэшце, пасля перавароту Пілсудскага (у маі 1926 года) рассеяліся, як дым, і апошнія астаткі буржуазнай дэмакратыі Польшчы. Уся ўлада перайшла да прэзідэнта, а сейм зрабіўся бездапаможнай установай, паслухмянай цацкай у руках пілсудчыкаў.

У 1935 годзе пілсудчыкі сфабрыкавалі і правялі ў жыццё новую канстытуцыю. Згодна гэтай канстытуцыі, «адзіная і непадзельная дзяржаўная ўлада» належыць прэзідэнту Польскай рэспублікі, які стаяў на чале дзяржавы. На ім, як гэта гаварылася ў польскай канстытуцыі, ляжала «адказнасць перад богам і гісторыяй за лёс дзяржавы».

Да чаго прывяла такая «адказнасць» пана Масціцкага і яго клікі, мы добра ведаем. Польшча, як дзяржава, аснованая на прыгнечанні і эксплаатацыі народа, дзяржава, якая папірала інтарэсы і правы прыгнечаных нацыянальнасцей, — распалася. Яе незадачлівыя правіцелі ўцяклі.

Не лепш абстаіць справа з дэмакратыяй і ў іншых буржуазна-дэмакратычных дзяржавах.

Буржуазная дэмакратыя **на словах** прадастаўляе грамадзянам свабоду слова, друку, свабоду сходаў, арганізацый саюзаў і т. д. А **на справе** ўсё гэта пусты гук, бо працоўныя капіталістычных краін не маюць патрэбных для сходаў памяшканняў, не маюць друкарань і паперы для друкавання газет, кніг і т. д. Рэволюцыйныя сходы разганяюцца паліцыяй; газеты, якія пішуць аб патрэбах народа, закрываюцца; комуністы, якія заклікаюць працоўных да вызвалення ад капіталістычнага рабства, пападаюць у турмы, ссылкі, катаржныя работы. Вось вам і свабода слова, сходаў, сумлення і т. д.

Буржуазныя канстытуцыі хлусліва праўзгалашаюць роўнасць усіх грамадзян у палітычных правах. На гэты конт таварыш Сталін сказаў: «Гавораць аб роўнасці грамадзян, але забываюць, што не можа быць сапраўднай роўнасці паміж гаспадаром і рабочым, паміж памешчыкам і селянінам, калі ў першых ёсць багацце і палітычная вага ў грамадстве, а другія пазбаўлены і таго і другога, калі першыя з'яўляюцца эксплаататарамі, а другія эксплаатуемымі».

Як бачым, у капіталістычным грамадстве існуе дэмакратыя не для працоўных, а для багачоў, не для рабочых, а для дармаедаў, якія смокчуць кроў народную.

Па меры таго, як у краінах капітала ўзмацняецца рэволюцыйны рух, расце свядомасць пролетарыята і яго ўплыў на сялянства і на ўсіх працоўных, буржуазія ўсё больш і больш абмяжоўвае і ліквідуе так называемую буржуазную дэмакратыю. Панаванне імперыялізма азначае «паварот ад дэмакратыі да палітычнай рэакцыі»,—гаварыў Ленін. З пачаткам другой імперыялістычнай вайны знікае розніца паміж так называемымі буржуазна-дэмакратычнымі і фашысцкімі дзяржавамі. Капіталісты як тых, так і другіх дзяржаў вядуць імперыялістычную вайну, яны аднолькава ўзмацнілі эксплаатацыю працоўных. І тыя і другія ўстанавілі ваенны рэжым буржуазнай дыктатуры.

ШТО ТАКОЕ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЯ ДЭМАКРАТЫЯ?

Толькі ў СССР, пры соцыялістычным ладзе, дзе няма эксплаататараў, дзе ўсе без выключэння людзі роўныя ў сваіх правах, існуе сапраўдная дэмакратыя, дэмакратыя для ўсіх. Соцыялістычная дэмакратыя забяспечвае фактычны ўдзел усіх грамадзян у кіраванні дзяржавай. У чым гэта выражаецца?

У Сталінскай Канстытуцыі сказана, што ўся ўлада ў СССР належыць працоўным горада і вёскі ў асобе Советаў дэпутатаў працоўных. Ва ўсіх Советах дэпутатаў працоўных, пачынаючы ад Вярхоўнага Совета СССР і канчаючы сельскім або пасялковым Советам, працуюць выбраныя народам дэпутаты — рабочыя, сяляне, служачыя.

У СССР лік выбраных ва ўсе Советы дэпутатаў перавышае 1 мільён 288 тысяч чалавек.

Выбары ў нас праходзяць на самых дэмакратычных асновах. Кандыдатаў у дэпутаты вылучае сам народ на сходах па фабрыках, заводах, ва ўстановах, на сялянскіх сходах і т. д. Кандыдатуры гэтыя абгаварваюцца рабочымі, сялянамі, совецкай інтэлігенцыяй.

У панскай Польшчы, мы ведаем, існаваў зусім іншы парадак. Кандыдатаў у дэпутаты сейма, па апошняму выбарчаму закону, маглі вылучаць толькі акруговыя выбарчыя камісіі, у якіх усімі справамі запраўлялі пануючая верхавінка шляхты і яе прыслужнікі. Што датычыцца польскага сената, то трэцюю частку яго назначаў самаасабова прэзідэнт, а дзве трэціх выбіраліся знатнай верхавінкай.

У нас, у СССР, выбіраюць у Советы **ўсе грамадзяне,** дасягнуўшыя 18-гадовага ўзросту, за выключэннем пазбаўленых розуму і асоб, асуджаных па суду з пазбаўленнем выбарчых правоў.

Уся сістэма совецкіх выбараў строга забяспечвае **роўнасць кожнага выбаршчыка,** хто-б ён ні быў—мужчына ці жанчына, рускі ці беларус, украінец, паляк, яўрэй, ці скончыў ён універсітэт, ці зусім непісьменны. Кожны выбаршчык на выбарах мае адзін голас.

«У нас, — гаварыў таварыш Сталін,—няма капіталістаў, няма памешчыкаў, значыцца, і няма націску з боку маёмных класаў на немаёмных.

У нас выбары праходзяць у абстаноўцы супрацоўніцтва рабочых, сялян, інтэлігенцыі, у абстаноўцы ўзаемнага іх давер'я, у абстаноўцы, я-б сказаў, узаемнай дружбы, таму што ў нас няма капіталістаў, няма памешчыкаў, няма эксплаатацыі і некаму, уласна, давіць на народ для таго, каб сказіць яго волю.

Вось чаму нашы выбары з'яўляюцца адзінымі сапраўды свабоднымі і сапраўды дэмакратычнымі ва ўсім свеце».

У СССР палітычныя правы не толькі абвешчаны ў Канстытуцыі, але і забяспечаны матэрыяльнымі сродкамі. Канстытуцыя СССР не толькі абвяшчае права на працу, права на адпачынак, на асвету, на забеспячэнне ў час хваробы ці ў старасці, але і забяспечвае гэтыя правы прадастаўленнем грамадзянам работы, бясплатным навучаннем у школах, пенсіяй і дапамогамі на выпадак інваліднасці ці часовай непрацаздольнасці і т. д. Свабода слова, сходаў, друку, саюзаў у нас забяспечана на справе тым, што ўсе грамадскія будынкі, дзе могуць арганізоўвацца сходы, мітынгі і т. д., усе друкарні, запасы паперы і іншыя неабходныя сродкі з'яўляюцца агульнанародным здабыткам і служаць інтарэсам народа.

Правы грамадзян і палітычныя свабоды пры совецкай соцыялістычнай дэмакратыі забяспечаны эканамічнай магутнасцю краіны соцыялізма, магутным апаратам соцыялістычнай дзяржавы, маральна-палітычным адзінствам совецкага народа пад кіраўніцтвам рабочага класа на чале з комуністычнай партыяй. Працоўныя масы горада і вёскі дзейна ўдзельнічаюць у кіраванні Совецкай дзяржавай. Народ і ўрад у СССР адзіныя.

Совецкі Саюз падняў высока над светам сцяг сапраўднай дэмакратыі, дэмакратыі соцыялістычнай.

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

Нарада гаспадарнікаў-вылучэнцаў

Днямі абласным камітэтам КП(б)Б праведзена нарада гаспадарнікаў — рабочых-вылучэнцаў горада Беластока.

Адкрываючы нараду, сакратар абкома тав. Спасаў сказаў:

— Савецкая ўлада дала магчымасць лепшым сынам вызваленых з-пад іга капіталізма і нацыянальнага гнёту народаў Заходняй Беларусі стаць на кіруючую дзяржаўную і гаспадарчую работу, поўнасцю праявіць творчую ініцыятыву і арганізатарскія здольнасці ў соцыялістычным будаўніцтве. Цяпер па нашай вобласці сотні рабочых-вылучэнцаў паспяхова працуюць у дзяржаўных установах і прадпрыемствах. Але яшчэ ёсць асобныя кіраўнікі, якія да вылучэння лепшых людзей падыходзяць з боязню. Верна, гэтая справа адказная і патрабуе сур'ёзнага, удумлівага падыходу. Але, як правіла, трэба смялей вылучаць на кіруючую гаспадарчую работу правераных людзей — рабочых, асабліва моладзь. Адначасова трэба штодзённа дапамагаць у рабоце вылучэнцам, арганізаваць іх вучобу.

Мэта скліканай нарады — гэта ўстараніць перашкоды, якія яшчэ сустракаюцца ў рабоце вылучэнцаў.

Выступіўшыя на нарадзе таварышы абмяняліся вопытам работы і ўнеслі рад практычных прапаноў для палепшання работы прадпрыемстваў.

Тав. Каплан, дырэктар тэкстыльнай фабрыкі № 25, вылучэнка-тэкстыльшчыца, расказала, што на фабрыцы ўжо створан вытворчы актыў з рабочых, абапіраючыся на які, яна ажыццяўляе кіраўніцтва прадпрыемствам. Падабраны пастаянны састаў інжынерна-тэхнічных работнікаў. Работа фабрыкі наладжана.

Тав. Ротшыльд С., дырэктар стужкавай фабрыкі, крытыкаваў тэкстыльны трэст, які зусім не цікавіцца работай фабрыкі.

Тав. Гольдфарб, дырэктар завода млынавага абсталявання, у нядаўнім рабочы-токар, гаварыў аб недастатковым забеспячэнні завода металам і палівам. Дровы заводакіраўніцтвам купляюцца на рынку, што зусім недапушчальна і звязана з вялікімі перавыдаткамі. Адначасова ён адзначыў нездавальняючую работу горхарчпрамгандлю, які ў справе забеспячэння рабочых не праяўляе неабходнай аператыўнасці, допускае блытаніну.

Тав. Спыхала, намеснік дырэктара Беластоцкага комунальнага трэста, вылучэнец рабочы-тэкстыльчшык, спыніўся на пытаннях аказання дапамогі вылучэнцам, кантролі за іх работай і арганізацыі вучобы.

Тав. Ротшыльд Г., намеснік старшыні абласнога праўлення профсаюза шарсцянікаў, расказаў, што саюзам па вобласці вылучана на кіруючую работу 300 рабочых, якія спраўляюцца добра з работай.

У заключэнне выступіў сакратар абкома КП(б)Б тав. Касцюк, які сказаў:

— Вылучэнне лепшых людзей, пытанне кадраў—рашаючае пытанне. Да гэтага часу па нашай вобласці вылучана на кіруючую работу 812 чалавек. Гэтая колькасць будзе расці. Вылучаныя таварышы павінны настойліва працаваць над авалоданнем рэволюцыйнай тэорыяй—марксізмам-ленінізмам. Кожны работнік павінен добра ведаць палітычныя задачы, якія перад намі ставіць партыя і ўрад, бачыць перспектыву ў рабоце. А гэта даецца толькі пры авалоданні рэволюцыйнай тэорыяй.

В. Бемаў.

ШЫРЭЙ РАЗМАХ АБАРОННАЙ РАБОТЫ

Ваенны аддзел гарадскога камітэта КП(б)Б пачаў сваю работу з арганізацыі і разгортвання масавай абароннай і фізкультурнай работы ў горадзе. Цяпер мы ўжо маем па гораду звыш 50 пярвічных арганізацый Асоавіяхіма, якія налічваюць звыш 1000 членаў. Праяўляецца вялікі інтарэс працоўных да авалодвання ваеннымі спецыяльнасцямі.

Нашы масавыя абаронныя арганізацыі з'яўляюцца баявым рэзервам Чырвонай Арміі і Ваенна-Марскога Флота. Яны заклікаяы дапамагаць Чырвонай Арміі ў справе „папярэдняй“ „чарнавой“ работы па адпрацоўцы кадраў розных ваенных спецыяльнасцей“ (Варашылаў).

Склаўшаяся міжнародная абстаноўка патрабуе ад кожнага работніка Асоавіяхіма, Чырвонага Крыжа, ад кожнага савецкага патрыёта ўмацавання гэтага рэзерва, найшырэйшага размаху ўсёй масава-абароннай работы.

Для павышэння ведаў старшынь пярвічных арганізацый Асоавіяхіма ў першых чыслах сакавіка праведзены пяцідзённыя курсы старшынь пярвічных арганізацый Асоавіяхіма, на якіх займалася 45 чалавек. Цяпер працуюць 10-дзённыя курсы чырвона-крыжаўскага актыва, на якіх навучаецца 30 чалавек. Разгортвае сваю работу гарадскі камітэт Чырвонага Крыжа, ствараюцца пярвічныя арганізацыі. У горадзе арганізаваны гурткі па падрыхтоўцы і здачы норм на значок ГСА з ахопам 270 чалавек.

Неабходна адзначыць, як недахоп, што да гэтага часу ў горад не завезены яшчэ наглядныя дапаможнікі і літаратура для вучэбных пунктаў Асоавіяхіма і для абсталявання ваенных куткоў на прадпрыемствах і ўстановах. Гэта адбіваецца на якасці работы арганізацый Асоавіяхіма. Трэба ў самы кароткі тэрмін завезці неабходныя наглядныя дапаможнікі, падручнікі, а так сама поўнасцю ўкамплектаваць горсоветы Асоавіяхіма і Чырвонага Крыжа інструктарскім саставам.

Заключаны соцыялістычны дагавор на лепшую пастаноўку масава-абароннай работы паміж Беластокам і Гроднам паслужыць яшчэ большаму размаху работы на прадпрыемствах, фабрыках, заводах і навучальных установах. Задача абаронных арганізацый горада — шляхам масавай палітычна-выхаваўчай работы шырока разгарнуць соцыялістычнае спаборніцтва паміж пярвічнымі арганізацыямі Асоавіяхіма, Чырвонага Крыжа і фізкультурных арганізацый на лепшую пастаноўку масавай абароннай работы.

Пытанне росту Асоавіяхіма, Чырвонага Крыжа, добраахвотных спартыўных таварыстваў павінна знаходзіцца ў цэнтры ўвагі ўсіх нашых работнікаў і арганізацый. Ствараючы новыя арганізацыі, трэба забяспечыць іх арганізацыйнае ўмацаванне, паклапаціцца аб тым, каб уся іх работа з першых-жа дзён стала змястоўнай, цікавай, захапляючай. Уся дзейнасць советаў Асоавіяхіма, Чырвонага Крыжа павінна быць пранікнута клопатамі аб высокай якасці ваеннай вучобы. А трэба адзначыць, што ў гэтай справе ў нас далёка не ўсё ў парадку. Не ўсе дапрызыўнікі ахоплены здачай норм на абаронныя значкі, таксама як не ўсе дапрызыўнікі наведваюць школы па ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці. У вырашэнні гэтых пытанняў вялікую дапамогу павінны аказаць комсамольская арганізацыя горада, настаўніцтва і органы Наркомасветы.

С. Гудзееў,
загадчык ваенным аддзелам
Беластоцкага ГК КП(б)Б

Узорна падрыхтавацца да абласной алімпіяды мастацкай самадзейнасці

Рашэннем ЦК і абкома КП(б)Б у Беластоку будзе праведзена абласная алімпіяда мастацкай самадзейнасці. Алімпіяда будзе праходзіць тры дні—з 29 па 31 сакавіка. Задачай алімпіяды з'яўляецца выяўленне лепшых сіл народнай творчасці, маладога растучага мастацтва вызваленага народа. У алімпіядзе прыме ўдзел звыш тысячы народных музыкантаў, спевакоў, танцораў, расказчыкаў і іншых, у тым ліку 300 чалавек з вёсак і сёл вобласці. Адначасова будзе абсталявана выстаўка народнага выяўленчага мастацтва.

У вобласці ёсць зараз каля 200 гурткоў мастацкай самадзейнасці (у два разы больш, чым у студзені). Колькасць гурткоў павялічваецца з кожным днём. Большасць гэтых гурткоў ужо рабіла свае выступленні, прымала ўдзел у мастацкіх вечарах. Звыш 500 артыстаў, членаў ансамбляў, хораў, аркестраў і асобных выканаўцаў прадэманстравалі на гродненскай алімпіядзе росквіт народнай творчасці. Выдатныя самадзейныя калектывы, як хор мястэчка Крынкі ў саставе 180 чалавек, скідзельскі хор, танцавальны ансамбль Індуры, асобныя выканаўцы—55-гадовая танцоўшчыца сялянка вёскі Дубна Софія Паўлаўна Лапа і інш. — безумоўна прымуць удзел у абласной алімпіядзе.

Але ёсць вялікая колькасць гурткоў як у раёнах, так і ў самім Беластоку, якія яшчэ не разгарнулі сапраўднай творчай работы. Яны задавольваюцца паўтарэннем старога рэпертуара. Вінаваты тут і профсаюзы, якія недаацэньваюць работу гурткоў мастацкай самадзейнасці, вінаваты і дырэктары камбінатаў і фабрык, якія не ствараюць умоў для работы. Так зрываецца работа харавога і музыкальнага гурткоў на фанерным заводзе, з вялікімі перашкодамі сустракаецца кіраўнік гуртка мастацкай самадзейнасці на пятым тэкстыльным камбінаце, дзе дырэктар забараніў частыя рэпетыцыі гуртка. Не разумеюць значэння мастацкай самадзейнасці фабком і дырэкцыя 17 тэкстыльнай фабрыкі, дзе ёсць вялікія магчымасці для развіцця народнай творчасці. На жаль, падобных прыкладаў можна прывесці многа.

З 15 сакавіка пачаліся гарадскія і раённыя прагляды мастацкай самадзейнасці, на якіх будуць адбірацца лепшыя калектывы і індывідуальныя выканаўцы на алімпіяду. Прагляды закончацца да 23 сакавіка. 25 сакавіка адбудзецца алімпіяда беластоцкіх тэкстыльшчыкаў.

На працягу двух тыдняў, якія асталіся да алімпіяды, члены гурткоў мастацкай самадзейнасці і іх кіраўнікі павінны праявіць актыўнасць у справе выяўлення і падрыхтоўкі народных талентаў.

Рашэнні ЦК і абкома КП(б)Б абавязваюць таксама ўсе савецкія і партыйныя арганізацыі ўзначаліць справу падрыхтоўкі і правядзення алімпіяды, дапамагчы работнікам мастацтваў у іх творчай і арганізацыйнай рабоце.

Л. Ліpская.

ЗВАРОТ

ПЕРШАЙ АБЛАСНОЙ НАРАДЫ ПРАЦОЎНЫХ СЯЛЯН

ДА ЎСІХ СЯЛЯН БЕЛАСТОЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

ДАРАГІЯ ТАВАРЫШЫ!

Цяжкім і бяспраўным было жыццё працоўнага сялянства Заходняй Беларусі пад прыгнётам буржуазна-памешчыцкай польскай дзяржавы. Навечна запомняцца здзекі і ганенні над працоўнымі сялянамі, якія мы перанеслі за 20 год ад польскіх памешчыкаў і іх подлых служак.

Нястача і голад вымушалі нас за нікчэмныя грошы з раніцы да цёмнай ночы гнуць свае спіны — працаваць на памешчыка і багацея. Нашы бацькі, жонкі і дзеці працавалі на капіталістаў, будучы бяспраўнымі, не маглі мець доступу да навукі і былі непісьменныя. Нас сілком прымушалі быць вечнымі нявольнікамі ў паноў.

Лепшых сыноў і дачок нашага народа да смерці збівалі паліцыянты, кідалі ў турмы, прысуджалі да расстрэлу, высылалі на катаргу. Колькі гора і слёз праліта намі ад усіх гэтых нечуваных здзекаў і гора!

Разгульным было жыццё любамірскіх, патоцкіх і іншых памешчыкаў, якія валодалі дзесяткамі і сотнямі тысяч гектараў зямлі, якую мы, нашы бацькі, дзяды і прадзеды, палівалі сваім потам і крывёю. У той-жа час 8.287 сялян не мелі сваёй зямлі. 91.790 сялян мелі такую нікчэмную колькасць зямлі, што яна не задавольвала самых неабходных патрэб. Мы былі рабамі ў паноў! Нас кабалілі і разаралі адпрацоўкамі за лес і пасьбішча, за проценты па даўгах, за праезды праз панскую зямлю. Нас давілі цяжкія павіннасці і падаткі. Памешчыцкі бізун і дзяржаўны экзекутар не адступалі ад нас і нашых хат.

Вялікая і магутная Чырвоная Армія, кіруемая партыяй бальшавікоў і савецкім урадам, натхнёная на небывалыя ў гісторыі подвігі правадыром працоўных і прыгнечаных усяго свету, вялікім і любімым таварышам СТАЛІНЫМ, прынесла нам поўнае вызваленне. Зямля стала нашай! 85.927 гектараў памешчыцкай зямлі, 3.578 коней, 4.586 кароў, многа хлеба, бульбы, кармоў і іншага дабра атрымалі сяляне з прыходам Чырвонай Арміі. Знікла ў вечнасць бясхлебіца і голад, цемра і слёзы. З'яднаныя ў вялікім Савецкім Саюзе, мы ўпэўнены ў сваім заўтрашнім дні. Сталінская Канстытуцыя забяспечвае нам вялікія правы савецкіх грамадзян. Наша магутная Чырвоная Армія ахоўвае нашу мірную працу.

Увесь многамільённы савецкі народ у адзінай дружнай сям'і з дня ў дзень будуе новае жыццё, павялічвае багацце і магутнасць нашай соцыялістычнай Радзімы!

Калгаснае сялянства Савецкага Саюза, якое дасягнула нябачаных поспехаў у сельскай гаспадарцы, шырока разгортваючы соцыялістычнае спаборніцтва, упорна рыхтуецца зараз да веснавой сяўбы трэцяга года трэцяй сталінскай пяцігодкі, каб ужо ў гэтым годзе атрымаць ураджай зярна ў краіне 8 мільярдаў пудоў.

У гэтым годзе ўпершыню мы, сяляне Беластоцкай вобласці і ўсіх заходніх абласцей нашай ордэнаноснай Беларускай Савецкай Соцыялістычнай Рэспублікі, будзем сеяць на нашай народнай зямлі.

Вясна гэтага года будзе для нас бальшэвіцкай вясной, калі мы, вольныя людзі на вызваленай зямлі, будзем працаваць без капіталістаў і памешчыкаў.

Мы павінны пасеяць ў гэтым годзе зернавых, лёну, бульбы, гародніны, табакі, кармовых культур такую колькасць, каб было дастаткова прадуктаў для сябе і для продажу рабочым, каб было дастаткова сыравіны для нашых фабрык, вырабляючых для нас-жа патрэбныя тавары, каб было многа кармоў для жывёлы, каб у цэлым у вобласці і ў кожнай вёсцы ні аднаго гектара зямлі не асталося незасеяным.

У гэтым нам дапамагае ўстанаўліваемы дзяржаўны план сяўбы, які поўнасцю адпавядае нашым інтарэсам і патрэбнасцям, прадугледжваючы пасеў яравых зернавых 265.283 га, лёну 12.813 га, табакі 1.900 га, бульбы 148.501 га, гародніны 6.000 га, кармавых культур 61.475 га.

Савецкая ўлада ўжо ў гэтым годзе аказвае нам велізарную дапамогу. У нашай вобласці ствараецца 24 машынна-трактарных станцыі, якія сваёй магутнай перадавой тэхнікай дапамогуць нам у падняцці ўраджаю. Арганізаван 161 зернаачышчальны пункт, дзе мы абавязаны да 1-га красавіка правесці ачыстку і сартыроўку ўсяго нашага насення. Для дапамогі нам у раёны накіроўваюцца агратэхнікі, аграномы, заатэхнікі, ветурачы і іншыя спецыялісты сельскай гаспадаркі.

Перадавыя сяляне нашай вобласці, сяляне-беднякі і серадняки, былыя батракі аб'ядноўваюцца ў першыя соцыялістычныя гаспадаркі — калгасы.

Мы добра ведаем, што ўраджай сам не прыходзіць, яго трэба заваяваць. А гэта справа ў нашых руках, таварышы сяляне! Да атрымання добрага ўраджаю трэба рыхтавацца зараз.

Мы, сяляне, сабраўшыся на першую абласную нараду, зварочваемся да ўсіх сялян з наступным:

Мы ведаем, што добрае насенне гэта залог атрымання высокага ўраджаю. Таму трэба ў бліжэйшыя 5—10 дзён закончыць абмалот, добра ачысціць і адсартаваць усё насенне на зернаачышчальных машынах, з тым, каб засеяць нашу зямлю высокаякасным адборным зярном. Удзяліце асобую ўвагу захаванню бульбы. Праверце пасеўныя якасці насення. Трэба, каб кожная сялянская гаспадарка забяспечыла сама сябе поўнасцю насеннем усіх культур высокай якасці.

Улічваючы, што ў паспяховым правядзенні веснавой сяўбы вялікую ролю будзе адыгрываць своечасова падрыхтаваны і адрамантаваны сельскагаспадарчы інвентар, мы зварочваемся да ўсіх сялян, да ўсіх кавалёў, рымараў і калёснікаў закончыць поўны рамонт плугоў, барон, калёс, збруі і іншага сельгасінвентару не пазней 1-га красавіка.

Ранняя сяўба, поўнае скарыстанне мінеральных і арганічных угнаенняў — залог падняцця ўраджаю.

Мы ставім перад кожным селянінам задачу, каб веснавая сяўба ў гэтым годзе была праведзена ў сціслыя раннія тэрміны, каб поўнасцю скарыстаць вясеннюю вільгаць. Мы заклікаем поўнасцю ўнесці ў зямлю ўсю наяўнасць гною, кабыць мінеральныя ўгнаенні, арганізаваць збор і ўнясенне ў глебу попелу, курынага памёту, торфу і іншых мясцовых угнаенняў.

Калгаснае сялянства Савецкага Саюза разгарнула шырокае спаборніцтва за атрыманне ў гэтым годзе ўраджаю ў 100 пудоў з гектара. Мы заклікаем вас арганізаваць спаборніцтва паміж раёнамі, сельсоветамі, калгасамі, соўгасамі, вёскамі за атрыманне сталінскага высокага ўраджаю зернавых, лёну, бульбы, гародніны і іншых культур. Асабліва мы зварочваемся да сялян раёнаў, размешчаных вакол нашых гарадоў. Працоўныя гарадоў павінны атрымаць дастатковую колькасць гародніны, а для гэтага трэба, каб мы пасеў гародніны ўсямерна пашыралі, правялі сяўбу ва ўстаноўленыя тэрміны, устанавілі належны догляд за імі і забяспечылі снабжэнне гарадскога насельніцтва гароднінай.

Таварышы сяляне! Нельга забываць, што для атрымання высокіх ураджаў вялікае значэнне для нас мае жывёлагадоўля. Неабходна павялічыць пагалоўе жывёлы, захаваўшы поўнасцю прыплод цялят, жарабят, ягнят. Рашуча выкрываць ворагаў народа і дзяржавы, агітуючых за знішчэнне жывёлы.

У нашай вобласці ёсць яшчэ гаспадаркі, у якіх няма коней і якія будуць мець патрэбу ў цягавай сіле ў часе падрыхтоўкі да веснавой сяўбы і правядзення яе. Таварышы сяляне! Не дапускайце пакідання ні аднаго незасеянага гектара. Акажам соцыялістычную дапамогу бясконным гаспадаркам, з тым каб яны своечасова і поўнасцю засеялі сваю зямлю.

Таварышы сяляне! Уся наша работа па будаўніцтву новага жыцця выклікае ярасць і шалёную нянавісць ворагаў працоўных: памешчыкаў, фабрыкантаў, кулакоў і іх прыспешнікаў, якія мараць яшчэ аб звароце памешчыцкіх маёнткаў, фабрык і заводаў. Мы заклікаем вас даваць рашучы адпор усім вылазкам ворагаў, якія імкнуцца пашкодзіць нашаму руху наперад. Узмацнім нашу пільнасць і непрымірымасць да ўсіх тых, хто перашкаджае будаўніцтву нашага новага жыцця. Аднадушным удзелам і галасаваннем за кандыдатаў сталінскага блока комуністаў і беспартыйных дакажам сваю адданасць нашай соцыялістычнай радзіме, правадару і настаўніку таварышу Сталіну!

Вясна 1940 года будзе для нас першай бальшэвіцкай вясной. Ператворым першы дзень выхаду ў поле ва ўсенароднае свята — свята барацьбы за высокі сталінскі ўраджай!


Няхай жыве наша вялікая і прыгожая радзіма—Саюз Савецкіх Соцыялістычных Рэспублік!

Няхай жыве вызваленае працоўнае сялянства заходніх абласцей БССР!

Няхай жыве наша слаўная комуністычная партыя бальшавікоў!

Слава вялікаму правадыру, настаўніку і другу роднаму любімаму СТАЛІНУ!

(Прынята аднагалосна на абласной нарадзе сялян 15 сакавіка 1940 г.).



ЗА РУБЯЖОМ

ЗАМЕЖНЫ ДРУК АБ ЗАКЛЮЧЭННІ МІРНАГА ДАГАВОРА ПАМІЖ СССР І ФІНЛЯНДЫЯЙ.

ЛІТВА

Каунас, 16 сакавіка. (ТАСС). Літоўскія газеты працягваюць друкаваць артыкулы, прысвечаныя совецка-фінляндскаму мірнаму дагавору. Газеты падкрэсліваюць велізарныя задавальненні, з якімі сустрэнут дагавор у Літве. Газета «Лієтувос жыніос», ацэньваючы дагавор, піша: «Мір на паўночным усходзе Еўропы — факт становучага значэння ва ўсіх адносінах». Газета «Фольксблат» піша: «Заключэннем дагавора ўрад СССР яшчэ раз падкрэсліў, што ён з'яўляецца верным паслядоўнікам палітыкі міру.

З самым вялікім задавальненнем гэты мір сустрэлі прыбалтыйскія краіны, ад граніц якіх аддалілася вайна».

ЛАТВІЯ

Рыга, 16 сакавіка. (ТАСС). Ацэньваючы совецка-фінляндскі мірны дагавор, газета «Яунакас зініас» піша: «Заканчэнне канфлікта паміж Совецкім Саюзам і Фінляндыяй мы ўспрыймаем з вялікім задавальненнем. Пункт гледжання Латвіі, як гэта ўжо многа разоў дэклараваў наш урад, заўсёды быў і будзе аднолькавы: у кутку Еўропы , дзе мы жывём, павінен панаваць мір.

Совецкі Саюз новым дагаворам зацвердзіў бясспрэчнае права суверэнітэта сваёй дзяржавы. Абедзве дзяржавы агаласілі сваё жаданне паважаць узаемныя жыццёвыя інтарэсы. Заключаны дагавор сведчыць аб тым, што самым важным для народаў з'яўляецца мір супрацоўніцтва».

—о—

11-я КАНФЕРЭНЦЫЯ МІНІСТРАЎ ЗАМЕЖНЫХ СПРАЎ ЭСТОНІІ, ЛАТВІІ І ЛІТВЫ

Рыга, 16 сакавіка. 14—16 сакавіка ў Рызе адбылася чарговая 11-я канферэнцыя Балтыйскай Антанты. Балтыйская Антанта ў саставе Эстоніі, Латвіі і Літвы была створана ў 1934 годзе. 12 верасня 1934 года прадстаўнікі гэтых дзяржаў падпісалі дагавор дружбы і супрацоўніцтва. На чарговай 11-й канферэнцыі прысутнічалі міністр замежных спраў Эстоніі Пійп, міністр замежных спраў Латвіі Мунтэрс і міністр замежных спраў Літвы Урбшыс.

Сёння апублікавана наступнае камюніке аб выніках гэтай канферэнцыі:

«Разгледзеўшы вынікі супрацоўніцтва трох краін з часу апошняй канферэнцыі міністраў замежных спраў, якая адбылася ў Таліне ў снежні, тры міністры замежных спраў са здавальненнем канстантуюць, што гэта супрацоўніцтва адбывалася ў поўным аднадушшы, у духу пакта ўзаемаразумення і супрацоўніцтва ад 12 верасня 1934 года і ў адпаведнасці з прынцыпамі, якія былі агалашоны ў гэтым пакце, і адзначаюць прагрэс ва ўсіх пытаннях іх узаемаадносін. Атрыманы да гэтага часу вопыт прыводзіць міністраў трох краін к выніку, што палітыка нейтралітэта, праводзімая балтыйскімі дзяржавамі, абавязацельствы, прынятыя гэтымі дзяржавамі на сябе, і агульныя іх паводзіны ў сувязі з задачамі, якія ўзніклі з прычыны цяперашняга міжнароднага становішча, адказваюць поўнасцю іх цвёрдаму рашэнню застацца па-за ўзброеным канфліктам і забяспечыць іх незалежнасць і безапаснасць. Яны будуць вітаць ініцыятыву, якая накіравана да стварэння справядлівага і трывалага міру сярод народаў, і будуць садзейнічаць па меры сваіх сіл дасягненню гэтай мэты.

Тры міністры са здавальненнем успрыймаюць устанаўленне мірных адносін паміж СССР і Фінляндыяй. Для таго, каб у корані перамагчы эканамічныя цяжкасці, выкліканыя ваенным становішчам, якія даюць сябе адчуваць ва ўсіх краінах, уключаючы і балтыйскія, тры міністры замежных спраў аднадушны ў выражэнні пажадання, каб цяперашняе супрацоўніцтва трох дзяржаў у эканамічных пытаннях працягвалася і ўзмацнялася, і рашылі прызваць кіраўнікоў эканамічнага жыцця трох дзяржаў, прыкласці ўсе намаганні для дасягнення гэтай мэты. Тры міністры замежных спраў, ацэньваючы велізарную ролю культурных сувязей у справе зближэння народаў, са здавальненнем прымаюць да ведама прапанову, зробленую па гэтаму пытанню адпаведнымі ўстановамі і арганізацыямі, якія клапоцяцца аб зближэнні паміж балтыйскімі народамі і рашаюць прыкласці ўсе намаганні для расшырэння культурнага супрацоўніцтва ўжо існуючага паміж трыма краінамі.

12-я канферэнцыя будзе склікана міністрам замежных спраў Літвы ў верасні 1940 года.

Рыга, 16 сакавіка, 1940 года.

(ТАСС).

Нарвежская рабочая партыя змыкаецца з рэакцыяй

Осло, 16 сакавіка.

Прадстаўнік комунальных рабочых у кіраўніцтве бергенскага камітэта нарвежскай рабочай партыі Свере Іргенс заявіў, што „кіраўніцтва нарвежскай рабочай партыі вядзе да таго, што ў хуткім часе нарвежскія рабочыя страцяць усе свае дэмакратычныя заваёвы". „У цяперашні час, — гаворыць ён, — у краіне расце дарагоўля і некаторыя, карыстаючыся ваеннай кан'юнктурай, нажываюць мільёны. Нарвежская рабочая партыя замест таго, каб абараняць правы рабочых, усё больш змыкаецца з рэакцыяй".

Старшыня бергенскага прафсаюза рабочых цэментнай прамысловасці заявіў, „што палітыка і праграма нарвежскай рабочай партыі не адпавядае патрабаванням рабочых, а дзеянні нарвежскай рабочай партыі ў прафсаюзных арганізацыях накіраваны да раскола рабочага руху і могуць быць выгадны толькі капіталістам".

(ТАСС)

БАРАЦЬБА ЗА НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ ІНДЫІ.

Нью-Йорк, 16 сакавіка.

Карэспандэнт агенцтва Юнайтэд Прэс паведамляе, што былы старшыня Індыйскага нацыянальнага кангрэса Субха Чандра Бос заявіў аб распрацоўцы ім праграмы патрабаванняў аб прадастаўленні поўнай незалежнасці Індыі. Бос абвінавачваў Гандзі ў тым, што апошні ўсімі спосабамі імкнуўся адкласці пачатак кампаніі за незалежнасць Індыі. „У выніку кампраміснай палітыкі Гандзі, — заявіў Бос, — якую ён праводзіць з верасня мінулага года, у Англіі стварылася ўражанне, што мы не жадаем весці барацьбу за незалежнасць Індыі". Бос заявіў, што ўзначальваемы ім блок, які вядзе барацьбу за незалежнасць Індыі, завае на прадстаячай сесіі кангрэса большасць, якая належыць цяпер Гандзі.

КОРАТКА

У Рым прыбыла японская місія на чале з былым міністрам замежных спраў Сато. Гэты прыезд з'яўляецца адказным на мінулагодняе наведванне Японіі італьянскай місіяй.

У Ганконга пажарам знішчаны склады англійскай мануфактурнай кампаніі каштоўнасцю ў 1 мільён ганконскіх долараў.

(ТАСС).

ПАДАРУНАК ПРАВАДЫРУ

Селянін вёскі Жукі, Пасынкаўскага сельсовета, Заблудаўскага раёна, Нікалай Паўлавіч Ільяшук чатыры годы сядзеў у польскіх турмах як палітзняволены. Ён павінен быў адсядзець яшчэ два годы, але вызваліла яго з турмы гераічная Чырвоная Армія, якая вызваліла увесь прыгнечаны польскім панствам народ Заходняй Беларусі і Украіны.

У знак удзячнасці за вызваленне свайго народа тав. Ільяшук рашыў зрабіць падарунак вялікаму вызваліцелю і правадыру народаў таварышу Сталіну. І вось вынікам трохмесячнай работы з'явілася надзвычайная па арыгінальнасці шкатулка, вялікі пояс і іншыя рэчы.

Шкатулка гэта, вышынёй у 10 сантыметраў, даўжынёй 30 і шырынёй 20 см., зроблена сама з дрэва. Сценкі яе так майстэрска аблеплена спецыяльна прыгатаваным і афарбаваным хлебным цестам, што фон атрымаўся бліскуча чорны, нібы глазур. Па гэтым фоне з бакоў шкатулка ўпрыгожана інкрустацыяй розных колераў саломы і краляў, якія ўтвараюць прыгожы беларускі арнамент. Крышка шкатулкі аформлена цалкам інкрустацыяй розных колераў бірузы. З чырвоных краляў выкладзена вялікая зорка, з чорных — партрэт таварыша Сталіна і з розных колераў словы: «дарагому вызваліцелю заходніх беларусаў, бацьку і настаўніку таварышу Сталіну».

У шкатулцы змяшчаецца майстэрска зроблены з грушавага дрэва рэзны партсігар, пояс і брэлак. Пояс, даўжынёй у метр, цалкам звязан і сплецен з фарбаванага конскага воласу. Плеценыя ланцужкі і кружкі з кісцямі, у якія ўстаўлены гранёныя шкляныя кралі, надаюць поясу від беспадобны.

Гэтак-жа тонка сплецен і звязан брэлак з воласу натуральнага колеру.

Сваю выдатную работу тав. Ільяшук прысвячае і дарыць любімаму правадыру таварышу Сталіну.

—о—

СЦЯГ І ПЯЧАТКА СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧАЙ КОМУНЫ З 1919-га ГОДА.

Мір, (Баранавіцкая вобласць). У вёсцы Бекі, Мірскага раёна, у 1919 годзе была арганізавана сельскагаспадарчая комуна імені Леніна. Усе дакументы комуны: пячатка, штамп і сцяг захоўваліся ў Сямёна Васільевіча Бічарскага.

Калі тэрыторыя Заходняй Беларусі была акупіравана белапалякамі, то Бічарскага арыштавалі Яго жонка захавала ў страху пячатку і штамп комуны. Другі член комуны, Софія Крапіўніцкая схавала сцяг комуны. З гэтым сцягам у верасні 1939 года сустракалі родную Чырвоную Армію.

У сучасны момант пячатка і штамп комуны перададзены сельскаму совету. У вёсцы Бекі па ініцыятыве Сямёна Васільевіча Бічарскага арганізаван калгас, у які ўступіла 170 гаспадарак.

Новы калгас сяляне зноў назвалі імем Леніна.

—о—

ПІОНЕРЫ АФАРМЛЯЮЦЬ ВЫБАРЧЫЯ ЎЧАСТКІ

Нядаўна па нашай вобласці пачаўся прыём у піонеры. Дзеці з вялікай радасцю ўступаюць у сваю арганізацыю. За кароткі тэрмін толькі па гор. Беластоку створана 16 піонерскіх атрадаў, у якіх налічваецца 357 дзяцей. На грудзях юных патрыётаў горада гараць чырвоныя гальштукі.

Многія піонеры і вучні актыўна ўдзельнічаюць у выбарчай кампаніі. Так, піонерскі калектыў 32 няпоўнай сярэдняй школы дапамог афарміць 71 выбарчы ўчастак, зрабіў флажкі. Для выбаршчыкаў гэтага ўчастка школьнікі часта дэманструюць сваю мастацкую самадзейнасць: даюць харавыя і танцавальныя выступленні, дэкламацыі.



На здымку: тав. Каразімава, работніца выдатніца інструктар цэха гладкіх станкоў на плюшавай фабрыцы № 31 у Беластоку. (Фота Сапір).

ПА БЕЛАСТОКУ І ВОБЛАСЦІ

РАДЫЁФІКАЦЫЯ ВЫБАРЧЫХ УЧАСТКАЎ БЕЛАСТОКА

Заканчваецца радыёфікацыя выбарчых участкаў г. Беластока.

Сіламі беластоцкага радыёкамітэта і радыёвузла, пры актыўным удзеле самых выбаршчыкаў амаль на ўсіх участках устаноўлены радыёпрыёмнікі і абсталяваны трансляцыйныя кропкі.

Рад выбаршчыкаў прадставілі ў распараджэнне выбарчых участкаў на час выбарчай кампаніі свае ўласныя радыёпрыёмнікі.

—о—

ЛЕКЦЫІ Ў РАЁННЫМ КЛУБЕ

У дапамогу вывучаючым гісторыю партыі Снядоўскі райком партыі арганізаваў у раённым клубе лекцыю па першаму раздзелу «Кароткага курса гісторыі ВКП(б)». Праведзена таксама лекцыя для агітатараў на тэму: «Асноўныя задачы трэцяй сталінскай пяцігодкі». Абедзве лекцыі прачытаў лектар абкома партыі тав. Кяшэнь. Слухачы асталіся вельмі задаволенымі і прасілі ў далейшым часцей наладжваць такія лекцыі і па іншых пытаннях.

—о—

ПАЧАЛІСЯ ЗАНЯТКІ Ў ПЕДІНСТЫТУЦЕ

Учора пачаліся заняткі ў Беластоцкім педагагічным інстытуце. Гэта другі педінстытут у нашай вобласці.

Да вучобы прыступілі 120 студэнтаў. 47 з іх займаюцца на фізіка-матэматычным факультэце, астатнія на геаграфічным, літаратурным і факультэце замежных моў. У інстытуце 14 выкладчыкаў.

ЭКСПАНАТЫ НАРОДНАЙ ТВОРЧАСЦІ

У сувязі з падрыхтоўкай да дэкады беларускага мастацтва ў Маскве, Беластоцкі Дом народнай творчасці збірае ў вобласці экспанаты народнага мастацтва.

Да гэтага часу сабрана ўжо 500 экспанатаў розных тканін і разьбы па дрэву. Асабліва цікавыя экспанаты атрыманы з Бельскага, Гродненскага і Скідзельскага раёнаў. Сярод іх добрым выкананнем выдзяляецца тканіна, прысланая з вёскі Міневіны, Скідзельскага раёна, на якой вышыт герб БССР. Гэтую тканіну зрабілі сялянкі сёстры Парайка пры дапамозе настаўніка тав. Бжушкевіча.

—о—

ЗДАРЭННЕ

У ноч з 29 на 30 студзеня злодзеі Цукер П. Л., Краснадэмбскі І. А., Закрэўскі І. І. і Астатка К. І. шляхам узлому дзвярэй прабраліся ў цырульню па вуліцы Гелдовай, 9. Тут яны зрабілі кражу цырульных інструментаў на 236 рублёў, праламалі сцяну суседняга склада горхарчпромгандлю і ўкралі адтуль 400 пар галош.

Пры расследаванні ўстаноўлена, што яны і ў мінулым займаліся злачынствам.

Частка ўкрадзеных рэчаў знойдзена на кватэры саўдзельнікаў злачынства Рохверга Т. М. і яго сястры Эдэльштэйн Б. М.

Усе злачынцы арыштаваны. Расследаванне справы закончана і перадана суду.

Адказны рэдактар
Б. М. ЗЕЛЬМАНАЎ.

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Беласток, будынак Аблвыканкома. Тэлефоны рэдакцыі: адказнага рэдактара—22; партаддзела і сакратарыята—23; сельскагаспадарчага, культурнага, літаратуры і мастацтва, школьнага і інфармацыйнага аддзелаў—17.62 выдавецтва і аддзел аб'яў—16-10; друкарня і начная рэдакцыя 5.21. Падпіску на газету прымае Саюздрук тэл. 5.14.

Упаўнаважаны абліта № 374. 1-я дзяржаўная друкарня ў г. Беластоку